УДК 821. 161. 3

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ РЫГОРА БАРАДУЛІНА Ў КАНТЭКСЦЕ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “СУСВЕТНАЯ І АЙЧЫННАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА”: ТЭАРЭТЫЧНА-ЖАНРАВЫ АСПЕКТ

**Шарапава Алена Васільеўна**
старшы выкладчык кафедры “Беларуская, руская і замежная мовы” ДУ ВПА “Беларуска-Расійскі ўніверсітэт”
(г. Магілёў, Беларусь)

Пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы па спецыяльнасці “Дашкольная адукацыя” важнае месца займае вучэбная дысцыпліна “Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура”. Выпускнік павінен ведаць спецыфічныя ўласцівасці дзіцячай кнігі, што базіруюцца на ўліку ўзроставай спецыфікі чытача, характэрныя прыкметы розных жанраў дзіцячай літаратуры, віды работ з канкрэтным літаратурным творам ва ўстановах дашкольнай адукацыі і іншае. Фарміраванню падобных кампетэнцый, вызначаных тыпавой праграмай [2, с. 4–5], садзейнічаюць розныя метады працы студэнта і выкладчыка. У такім кантэксце важным элементам педагагічнай сістэмы з’яўляецца вывучэнне літаратурнай спадчыны Рыгора Барадуліна. Тыпавой вучэбнай праграмай ТД-А.256/ тып. на вывучэнне творчасці названага аўтара адводзіцца чатыры аўдыторныя гадзіны: дзве лекцыйныя і дзве практычныя [2, с. 7]. Адзначым, што, улічваючы спецыфіку творчасці пісьменніка, вывучэнне гэтай тэмы праводзіцца па жанравым прынцыпе. Зыходзячы з гэтага, студэнтам пастаянна згадваюцца такія паняцці, як “літаратурны род”, “лірыка”, “эпас”, “літаратурны жанр”, “фальклорны жанр”, “літаратурная казка”, “верш”, “калыханка”, “загадка” і інш. [гл. 1].

Увесь матэрыял па тэме “Рыгор Барадулін” можа быць умоўна падзелены на тры блокі: 1) для лекцыі; 2) для практычных заняткаў; 3) для самастойнай работы. Пры выкладанні дысцыпліны “Сусветная і айчынная дзіцячая літаратура” выпрацавана сістэма работы, што прадугледжвае пры падрыхтоўцы да заняткаў выкананне пэўнага комплексу заданняў, якія садзейнічаюць фарміраванню і развіццю належных кампетэнцый. Студэнты працуюць самастойна, звяртаюцца да літаратуразнаўчых крыніц з тым, каб пацвердзіць ці абвергнуць свае думкі і гіпотэзы.

На лекцыі студэнтам прапануюцца наступныя пытанні: 1. *Звесткі з біяграфіі Рыгора Барадуліна (1935-2014).* 2. *Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна для дзяцей.* 3. *Мастацтва славеснай гульні ў творчасці Р. Барадуліна для дзяцей.*

Пры характарыстыцы першага пытання студэнтам рэкамендуецца ўносіць запісы ў стандартную табліцу, якая выкарыстоўваецца пры вывучэнні ўсіх манаграфічных тэм дысцыпліны[1]. Пры гэтым у слупок “ЗАЎВАГІ” запісы ўносяцца і пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў, і ў кантэксце самастойнай работы студэнта. Падобная праца дапамагае лепш зразумець вытокі творчасці аўтара, вызначыць прататыпную, фальклорную, літаратурную аснову яго мастацкіх тэкстаў. Другое пытанне лекцыі звязана з асэнсаваннем тэарэтычных паняццяў. Таму важнае значэнне будзе мець зварот да “Слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў”, які студэнты вядуць з самага пачатку вывучэння дысцыпліны. Паняцці “верш”, “калыханка”, “забаўлянка”, “дражнілка”, “загадка”, “лічылка” “скорагаворка” і іншыя ўжо вядомыя студэнтам з тэмы “Вусная народная творчасць і беларуская дзіцячая літаратура”. Выкладчык жа

[1]

| ДАТА | ФАКТЫ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ | ЗАЎВАГІ |
|---|---|---|



ный архив библиотеки МГУ имени А.А.

актуалізуе паняцці “жарт”, “задачка”, “прыбабунька” і іншыя, прыводзіць прыклады твораў згаданых жанраў, падводзіць студэнтаў да наступнай высновы: “Характэрнымі асаблівасцямі вершаў Р. Барадуліна з’яўляюцца індывідуальна-аўтарскае напаўненне традыцыйных фальклорных жанраў сучасным зместам, тонкае адчуванне мовы, выкарыстанне прыёмаў гульні са словам, разуменне дзіцячага светаўспрымання”. Трэцяе пытанне лекцыі лагічна вынікае з другога. Мова некаторых вершаў Р. Барадуліна з’яўляецца своеасаблівай арфаэпічнай задачкай (“Індыкала-кудыкала”, “За бугром з багром”, “Запомні!” і інш.). Студэнтам спецыяльнасці “Дашкольная адукацыя” неабходна мець пэўнае ўяўленне пра магчымасць выкарыстання твораў паэта пры рабоце з дзецьмі з пэўнымі асаблівасцямі развіцця маўленчай сістэмы[1]. Вершы паэта могуць выкарыстоўвацца ў якасці моўнай гульні, бо ў іх ёсць “хто” і “што” для паказу, а таксама ўзаемаўзгадненне маўлення і руху, што фарміруе моўна-рухальны апарат галаўнога мозгу. Падобныя гульні можна выкарыстоўваць у якасці практыкаванняў на этапах аўтаматызацыі ці дыферэнцыяцыі гукаў. Таму працу з такімі “спецыяльнымі” вершамі можна працягнуць і развіць у працэсе выканання студэнтамі заданняў да самастойнай работы.

Самастойная работа студэнтаў выконваецца па наступным алгарытме: выкананне практыкаванняў, пісьмовае іх афармленне ў сшытку для самастойнай работы, праверка выкладчыкам гэтых практыкаванняў (франтальная або выбарачная). Неабходна адзначыць, што змест самастойнай работы вядомы студэнтам ужо з самых першых этапаў вывучэння дысцыпліны. Па тэме “Рыгор Барадулін” прапануюцца наступныя практыкаванні.

1. Падабраць з вершаў Р. Барадуліна тыя, што дапамогуць працягнуць запаўненне прапанаваных табліц. Падобнае заданне адлюстроўвае важнасць міждысцыплінарных сувязяў у кантэксце падрыхтоўкі будучага спецыяліста.

| Аўтаматызацыя свісцячых гукаў | Аўтаматызацыя шыпячых гукаў | Аўтаматызацыя санорных гукаў |
|---|---|---|
| **[с]** “Ці аса, ці куса”, “Як сурок лічыў сарок”, | **[ш]** “На шашы і ля шашы”, “Колькі кошак у кашы?” | **[л]** “Сляпень” |
| **[з]** “Воз вёз” | **[ж]** “Жытні сноп…” (“Азбука – вясёлы вулей”) | **[р]**“Скарагаворка са скарагаварчаняткамі”, “Кобра ў торбе”, “Рэгуліроўшчык”, |
| **[ц]** “Як быць”, “Вясновыя гукі” (“шпок-шпок”) | **[ч]**“Вясновыя гукі” (“чак-чак”), “Чакалі” | |

| Дыферэнцыяцыя свісцячых гукаў | Дыферэнцыяцыя шыпячых гукаў. Дыферэнцыяцыя шыпячых і свісцячых гукаў | Дыферэнцыяцыя санорных гукаў |
|---|---|---|
| **[с]** – **[с’]** “Сёння мамы – імянінніцы”, “Дзе гузак, а дзе гусак?” | **[ш]** – **[ж]** “Жарт”, “Колькі кошак у кашы?” | **[л]** – **[л’]** “Ліска і Лыска” |
| **[с]** – **[з]** “Не столькі мліва, колькі дзіва”, “Для каго? На каго?”, “Даўганосы сон” | **[с]** – **[з]** – **[ш]** – **[ж]** “Сонцаў сын – сланечнік”, “Каза і вінаграднік” | **[р]** – **[л]** “Красавік”, “Добры сон дзяўчынкі Ланы”, “Козытка”, “Калабок і карабок” |
| | | **[р]** – **[л]** – **[л’]** “Грамат не хапіла” |

2. Даць разгорнутую характарыстыку вобразнай сістэмы [гл. 1, с. 40–42] аднаго з вершаў Р. Барадуліна (па выбары студэнта). Даказаць, што слова-вобраз з’яўляецца асноўным стымулам актывізацыі фантазіі, мастацкага мыслення дзяцей у вершах-загадках, вершах-лічылках і г. д. (“Колькі кошак у кашы?”, “Ён, яна, яно, яны”, “Загадкі на градках” і інш.).

3. Прачытаць казкі Р. Барадуліна “Мех шэрых, мех белых”, “Бабуліна казка”, “Не паслухаў зайчык маму” і іншыя. Вызначыць фальклорныя казкі, што ляглі ў аснову аўтарскіх твораў. Запісаць вывады адносна падабенства і разыходжанняў гэтых казак па плане: а) вобразная сістэма; б) сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці; в) мова твораў.

На практычных занятках студэнтам прапануюцца наступныя пытанні для вывучэння і абмеркавання, а таксама практыкаванні да іх.

1. Развіццё эстэтычнага густу дзяцей праз пейзажныя вершы (“Зіма”, “Новы мост”, “Красавік”, “У дождж”, “Коцікі” і інш.). Пластыка і багацце фарбаў, выкарыстанне прыёму ўвасаблення пры стварэнні малюнкаў прыроды. Практыкаванне 1. Узгадаць азначэнне тэрмінаў “лірыка”, “верш”, назваць характэрныя сэнса- і формаўтваральныя асаблівасці названага літаратурнага роду і жанру. Практыкаванне 2. Запісаць у “Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў” азначэнне паняццяў “метафара”, “адухаўленне”, “ўвасабленне”, у якасці прыкладаў выкарыстаць цытаты з вершаў Р. Барадуліна.

2. Займальнасць пазнавальнага матэрыялу ў вершах пра жывёл (“Экзамен”, “Ці ляцяць вароны ў вырай?”, “Пеўнік-весялун”, “Ці пазяхае бегемот?” і інш.). Практыкаванне 1. Прачытаць вершы Р. Барадуліна і вызначыць, якія канкрэтныя пазнавальныя задачы аўтар ставіць перад рэцыпіентам. Практыкаванне 2. Напісаць план-канспект заняткаў па пэўнай адукацыйнай галіне для старшых груп выхаванцаў у дашкольных установах адукацыі з выкарыстаннем аднаго з прапанаваных вершаў паэта (па выбары студэнта).

3. Адлюстраванне дзіцячай псіхалогіі ў вершах (“Ай! Не буду! Не хачу!”, “Раскідач”, “Не такі… Не такое”, “Пытанне ўсім”, “Вінаваты тут не сшыткі”, “Хлопчык-усхопчык” і інш.). Практыкаванне 1. Прачытаць вершы паэта, вызначыць, якія рысы характару дзіцяці высмейваюцца ў іх. Практыкаванне 2. Узгадаць вершы іншых айчынных і замежных аўтараў, якія, як і Р. Барадулін, стваралі неверагодныя, фантастычныя, абсурдныя вобразы і сітуацыі і праз гэта вучылі рэцыпіентаў самастойна шукаць веды, правільна сябе паводзіць. Назіранні і вывады запісаць у сшытак.

4. Выкарыстанне твораў Р. Барадуліна ў працэсе выхавання (“Восьмы дзень сакавіка”, “Самая прыгожая”, “Добры месяц сакавік”, “Рэгуліроўшчык”, “Добрыя суседзі”, “Пытанне ўсім” і інш.). Практыкаванне 1. Прачытаць вершы паэта і вызначыць, якія рысы характару дзіцяці ўхваляюцца ў іх. Даказаць, што адсутнасць высокай-павучанняў і адкрытай дыдактычнасці з’яўляецца характэрнай асаблівасцю паэзіі Р. Барадуліна. Практыкаванне 2. Падрыхтаваць план інсцэніроўкі аднаго з вершаў паэта (па выбары студэнта).

5. Адметнасці азбук Р. Барадуліна “Азбука не забаўка” (1985, мастак А. Александровіч) і “Азбука – вясёлы вулей” (1994, мастак М. Казлоў). Практыкаванне 1. Прачытаць згаданыя зборнікі паэта, зрабіць вывад пра сувязь слова і малюнка, сэнсу слова і яго гукавой абалонкі. Свае назіранні падмацаваць канкрэтнымі прыкладамі, занатаваць іх у сшытак. Практыкаванне 2. Вылучыць тэматычныя пласты вершаў азбук (пра прыроду, пра Радзіму, пра чалавека і інш.), паказаць, якім чынам азбукі могуць быць выкарыстаны на розных відах заняткаў у дзіцячых установах.

Для праверкі ведаў студэнтаў па творчасці Р. Барадуліна мэтазгодна выкарыстаць комплекс тэставых заданняў, у якіх на адно пытанне даецца чатыры варыянты адказаў, і неабходна выбраць адзін − правільны − адказ.

[1] Зразумела, што ў ідэальным варыянце падобная праца ажыццяўляецца спецыялістамі − дэфектолагам, лагапедам. Разам з тым, вядома, што не ва ўсіх установах дзіцячай дашкольнай адукацыі ёсць карэкцыйна-педагагічныя пункты. Гэта робіць прапанаваныя рэкамендацыі актуальнымі.

| | |
|---|---|
| 1. Вызначце гады жыцця Р. Барадуліна<br>- 1912 − 1995; – 1920 − 1981; – 1917 − 2006;<br>**+ 1935 – 2014** | 11. У творчасці Р. Барадуліна вылучаецца жанр “прыбабунькі”. З якім жанрам яго можна суаднесці?<br>**+ прыказка**;- казка; – дражнілка; – загадка |
| 2. Пасля ўніверсітэта Р. Барадулін доўгі час працаваў у сферы<br>**+ журналістыкі;** – педагогікі; – выяўленчага мастацтва; – вытворчасці | 12. На якую планету пападае невук-задавака Максімка з касмічнай былі Р. Барадуліна “Не такі... Не такое…”?<br>**+ на Месяц**; – на Марс; – на Венеру; – на Сатурн |
| 3. Першы зборнік для дзяцей Р. Барадуліна паказаў выразную фальклорную аснову яго твораў. Як ён называўся ?<br>- “Ці пазяхае бегемот?”; **+ “Мех шэрых, мех белых”**; – “Азбука − вясёлы вулей”; – “Кобра ў торбе” | 13. Як звалі трох Ланіных сястрычак-капрызулек з вядомага верша Р. Барадуліна?<br>- Ай, не, не хачу!; **+ Ай, не буду, не хачу;** - Не буду, не трэба, не дам;<br>- Ірынка, Марынка ды Дзінка |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| | |
|---|---|
| 4. Каму прысвяціў Р. Барадуліна свае першыя дзіцячыя творы?<br>- сыну; – маленькай суседцы; – пляменніку;<br>**+ дачцэ** | 14. Як звалі галоўных герояў верша Р. Барадуліна “Добрыя суседзі”?<br>- Сястрыца Дабранач і Братка Добрай раніцы; -Дзед і Бабка Будзьце Здаровыя; – Гаспадыня Смачнаесці і яе дзеткі; **+ Дзядька Дзякуй і Цётка Каліласка** |
| 5. Назавіце скразных персанажаў у калыханках Р. Барадуліна?<br>- Дамінічка і мышка; **+ Лана і кот Мірон**;<br>- ваўчок і козытка; -Волечка ды Полечка | 15. *“Як махнуў ён рукавом // –Вылецелі ластаўкі”*. Які месяц, на думку Р. Барадуліна, можа так зрабіць?<br>- сакавік; **+ красавік**; – май; – чэрвень |
| 6. Да якога жанру (фальклорнага і літаратурнага аднучасова) адносяцца наступныя творы Р. Барадуліна: “Козытка”, “Хто перагаворыць Бая?”, “Ліса і вінаграднік”?<br>– калыханка; **+ забаўлянка**; – загадка; – лічылка | 16. У вершы “Год-карагод” Р. Барадуліна тлумачацца<br>- асаблівасці і назвы пораў года; -змены знакаў задыяка;**+ асаблівасці і назвы месяцаў**;– старадаўняе і сучаснае летазлічэнне |
| 7. У лічылцы-задачцы Р. Барадуліна “Колькі кошак у кашы?” гучыць пытанне: “*Ты падумай і скажы, // Колькі кошак у кашы?*” Адкажыце на яго<br>- адна; **+ ніводнай**; – дзевяць; – шмат | 17. Які стылістычны прыём паказальна выкарыстоўваецца ў такіх вершах Р. Барадуліна, як “На шашы і ля шашы”, “Чакалі” і інш.?<br>– кальцо;**+ алітарацыя**; – полісіндэтон; – анакалуф |
| 8. У дражнілцы Р. Барадуліна “Пыталава” поруч з фантастычнымі персанажамі і мясцінамі ўзгадваецца сапраўдны горад. Назавіце яго<br>- Мінск; **+ Рыга**; – Ашхабад; – Кракаў | 18. Пеўнік-весялун з аднайменнага верша Р. Барадуліна знайшоў зерне, з якога вырасце цэлы мех<br>- зерня; – цацак;**+ смеху**; – цукерак |
| 9. Устанавіце адпаведнасць паміж зборнікамі загадак Р. Барадуліна і іх тэматыкай. Выберыце правільную паслядоўнасць літар і лічбаў: А) “Загадкі на градках”, Б) “Падказкі-згадкі”, В) “Ён, яна, яно, яны”; 1) пра хатнія рэчы, 2) пра жывёл, 3) пра гародніну<br>- А1 Б2 В3; – А2 Б1 В3; – А1 Б3 В2;**+ А3 Б2 В1** | 19. На аснове верша Р. Барадуліна “Як стаў заяц даўгавухі” патлумачце прычыну такой асаблівасці зайца<br>**+ мядзведзь цягнуў зайца за вушы на яго імяніны**; – ліса цягнула зайца, каб з’есці, але той вырваўся; – бусел ратаваў зайца, калі той трапіў у палонку;- маці-зайчыха пацягала зайца за вушы за непаслухмянасць |
| 10. Якім чынам у “Бабулінай казцы” Р. Барадуліна воўк зрабіў сабе тоненькі галасок?<br>- трэніраваўся;- адкусіў сабе язык; **+ ваўку язык адцягнуў каваль**;- ваўку на язык наступіў мядзведзь | 20. У кнізе “Азбука – вясёлы вулей” Р. Барадулін параўноўвае літару “І” з<br>- стралой; – дрэвам; – алоўкам;**+ свечкай** |

Такім чынам, прапанаваная сістэма вывучэння тэмы “Рыгор Барадулін ” з улікам жанравай спецыфікі спрыяе фарміраванню ў будучага спецыяліста названых у пачатку дадзеных матэрыялаў кампетэнцый, садзейнічае найбольш поўнаму выяўленню здольнасцяў студэнтаў, а таксама своечасоваму правядзенню папераджальных і карэктуючых дзеянняў, уцягвае ў працэс пазнання ўсіх навучэнцаў. Сістэма апераджальных заданняў дае магчымасць студэнтам спрагназаваць уласны ўзровень сваіх вучэбных дасягненняў і супаставіць іх з крытэрыямі вучэбных патрабаванняў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Макарэвіч, А. М.* Беларуская дзіцячая літаратура ў тэрмінах і паняццях : дапаможнік / А. М. Макарэвіч, В. І. Караткевіч ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2014. – 140 с.
2. Мировая и отечественная детская литература : типовая учебная программа для высших учебных заведений по специальностям : 1 – 01 01 01 Дошкольное образование; 1 – 01 01 02 Дошкольное образование. Дополнительная специальность / сост. И. Г. Добрицкая, О. Б. Нестерович. – Минск, 2009. – 35 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова